ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 53 (807) || Субота, 30 снежня 1950 года || Цана 50 кап.

З НОВЫМ ГОДАМ, ТАВАРЫШЫ!

У гэтыя дні кожны совецкі чалавек, падводзячы вынікі сваёй працы і выбачаючы перспектывы, з асаблівай вызнасцю адчувае хвалюючы момант змены гадоў, сваю непарыўную сувязь з народам, з партыяй, з усёй краінай, яе любоўю і адданасць да таварыша Сталіна.

Радасць і ўрачыстасць совецкага чалавека вынікае з таго, што кожны новы год ва ўмовах нашага жыцця азначае сабой новы крок па шляху да комунізма, па шляху, які вызначае нам партыя Леніна—Сталіна.

З радасцю сустрэў совецкі народ пастанову ўрада аб будаўніцтве Волга-Данскога канала, рапарты вялікаму правадыру і настаўніку таварышу Сталіну аб датэрміновым выкананні пяцігадовага плана па вугалю, нафце, выпрацоўцы электраэнергіі і чыгуначнаму транспарту.

З удзячнасцю развітваючыся з мінулым 1950 годам, мы з непахіснай упэўненасцю ў сваіх планах і замыслах, у сваіх самых светлых спадзяваннях, сустракаем Новы, 1951 год, у якім нас чакаюць новыя поспехі, новыя перамогі нашай Радзімы ў будаўніцтве комунізма, у барацьбе за мір, за шчасце народаў.

Вялікія здабыткі прынёс мінулы год совецкаму народу. Гэта быў сапраўды незабыўны год. Год творчага наватарства, магутнага працоўнага энтузіязма, выкананага ў совецкіх людзей выдатнымі перамогамі перадавога дэмакратычнага лагера чалавецтва на чале з нашай Радзімай супраць імперыялістычнай рэакцыі, супраць ворагаў мірнай працы, падпальшчыкаў новай вайны.

Свет капіталізма з адчаем, з чорным сумам развітваецца з мінулым годам. З адчаем і сумам сустракае капіталізм Новы год, які набліжае яго да няўмолнага і непазбежнага лёсу — да гібелі.

Натхнёныя прыкладам гераічнай працы совецкіх людзей і іх барацьбой за сваё шчасце, з кожным днём растуць шырацца рады прыхільнікаў міру, верных сяброў Совецкага Саюза, будаўнікоў сапраўднай народнай дэмакратыі.

1950 год завяршыў сабой палову таго века, якому суджана поўнасцю ажыццявіць запаветную мару чалавецтва, ператварыць яе ў рэальную комуністычную рэчаіснасць.

Для працоўных нашай рэспублікі навагодні дзень звязаны з незабыўнай падзеяй у гісторыі беларускага народа — абвяшчэннем Беларускай социялістычнай дзяржавы.

У першы дзень Новага года Беларусь уступае ў 32 гадавіну свайго дзяржаўнага будаўніцтва. Плённымі здабыткамі адзначаюць працоўныя БССР гэты год. Пасяховае выкананне пасляваеннай сталінскай пяцігодкі, магутны рост індустрыялізацыі рэспублікі, аднаўленне разбураных гарадоў, адбудова нашай цудоўнай сталіцы, узбуйненне калгасаў і іх далейшае ўмацаванне, узбагачэнне нашай працы магутнай перадавой тэхнікай, рост добрабыту, глыбокія змены і перабудовы, якія з кожным днём нараджаюць і выхоўваюць усё новыя і новыя якасці характару нашых людзей, павышаюць іх патрабаванні, узровень іх здольнасцей, — усе гэтыя характэрныя рысы, уласцівыя мінуламу году, будуць яшчэ глыбей, яшчэ шырэй развівацца і ў 1951 годзе.

Няма ў нас ні аднаго такога працаўніка, якому стары год не прынёс-бы добрых вынікаў, а новы — яшчэ больш смелых планаў на будучае. Кожны, аглядаючы сваю працу, даючы справаздачу самому сабе, сваёй Радзіме, сёння перажывае законную гордасць: агульнымі намаганнямі мы за гэты год яшчэ вышэй узняліся ў сваіх магчымасцях, сталі яшчэ больш дужымі, больш блізкімі да сваёй мэты.

Разам са сваім народам плённа папрацавалі работнікі навукі і культуры, пісьменнікі, мастакі, акторы. Нам ёсць з чым павіншаваць нашу беларускую совецкую літаратуру. У сёлетніх лепшых творах мы пазнаём выразныя рысы года, рысы яго жывога аблічча, адрозніваем усё тое сапраўды новае, незабыўнае, што было ўласціва слаўнаму 1950 году. Такія творы, як «Толькі ўперад» А. Куляшова, «Чырвонгарадок» П. Броўкі, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Калі зацвітаюць сады» В. Палескага, палкія, натхнёныя вершы, прысвечаныя барацьбе за мір, совецкай Радзіме і вялікаму сцяганосцу міру таварышу Сталіну, нашых паэтаў Я. Коласа, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, А. Вялюгіна, К. Кірэенкі, П. Прыходзькі, аповесці і апавяданні М. Паслядовіча, Я. Брыля, І. Грамовіча, І. Шамякіна, А. Кулакоўскага, Т. Хадкевіча — усе яны адзначаны канкрэтнымі жыццёвымі рысамі 1950 года.

Нам ёсць з чым павіншаваць нашых артыстаў. На Усесаюзнай выстаўцы 1950 года яны паказваюць каля 30 іх лепшых твораў, у якіх адлюстраваны важнейшыя падзеі жыцця совецкай Беларусіны. Гэта работы скульптара З. Азгур, карціны Я. Зайцава, Я. Ціхановіча, Давідовіча, Я. Красоўскага і інш.

Нам ёсць з чым павіншаваць работнікаў тэатральнага мастацтва, стварыўшых такія спектаклі «Калінавы гай» і «Пяюць жаваранкі» — у тэатры імя Купалы; «Незабыўны 1919-ы», «Калі зацвітаюць сады», «Алазанская даліна» — у тэатры імя Я. Коласа, «Песня нашых сэрцаў» — у Рускім тэатры. Нашы кампазітары напісалі некалькі добрых інструментальных твораў і песень. Аднак, віншуючы з гэтымі дасягненнямі, нашы чытачы, гледачы і слухачы сёння, на парозе Новага года, маюць усе падставы не толькі пажадаць, але і патрабаваць ад нас у 1951 годзе значна больш вынікаў.

Больш новых, глыбока хвалюючых, выдатных па свайму майстэрству кніг, карцін, спектакляў, кінафільмаў, опер, сімфоній і песень! Больш новых імён пісьменнікаў, мастакоў, рэжысёраў, актораў, кампазітараў і музыкантаў!

Новы год павінен з'явіцца для ўсіх работнікаў літаратуры і мастацтва годам самага актыўнага ўдзелу ў жыцці рэспублікі, годам барацьбы за няўхільнае павышэнне ўзроўню нашай работы над сучаснай тэмай. Па тым, наколькі праўдзіва і глыбока будзем мы паказваць жыццё ў яго развіцці, совецкіх людзей — у іх духоўным росце, наша грамадства — у яго руху да комунізма, па тым, наколькі дзейсная і баявой з'явіцца наша зброя, совецкі народ — наш самы патрабавальны крытык і суддзя — будзе ацэньваць нашу працу, нашы творчыя здабыткі.

1950 год на зыходзе. Міне толькі адзін дзень, і мы ўжо будзем жыць у першым годзе другой паловы дваццатага века. Нам, совецкім людзям, і тым, хто ідзе па адной дарозе з намі, не прыходзіцца гадаць і думаць, што нясе нам новы год. Мы з цвёрдай упэўненасцю і шчырай радасцю сустракаем не толькі першы, але і кожны яго наступны дзень, бо мы ведаем, што і гэты год будзе годам нашага шчасця, годам нашых новых перамог, сапраўды незабыўным годам нашага жыцця. Вось чаму з такой глыбокай, з такой хвалюючай радасцю гучаць нашы віншаванні:

— З Новым годам!

...Калі стрэлкі гадзінніка сыйдуцца на лічбе 12 і Крэмлёўскія куранты абвесцяць усяму свету аб першай мінуце Новага года, дзе-б мы ні былі, нашай першай думкай у гэтае ўрачыстае імгненне будзе думка аб вялікім Сталіне.

Кожны чалавек на зямлі, які з надзеяй глядзіць на Маскву і чутка ўслухоўваецца ў пераможныя ўдары гадзінніка гісторыі, у гэтую хвіліну звярае біццё свайго сэрца з палымяным сэрцам правадыра чалавецтва, сцяганосца вялікай будучыні. І кожны з нас усімі самымі светлымі, самымі чыстымі пачуццямі гаворыць яму:

— З Новым годам, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, з новым шчасцем!

— З новымі перамогамі!

Насустрач рашаючым перамогам комунізма

★

Міхась ЛЫНЬКОЎ

★

Наступае 1951 год, першы год другой паловы дваццатага стагоддзя.

Што-ж новага нясе ён чалавеку? Што новага нясе ён усяму свету? З якімі думкамі, спадзяваннямі, марамі сустракаюць яго па ўсёй зямлі, на розных мацёрыках, за рознымі морамі і акіянамі?

Сустракаюць па-рознаму.

Капіталістычны свет — мы маем на ўвазе яго заправілаў, яго абаронцаў, усіх яго яўных і тайных слуг, прыхлябацеляў і плакальшчыкаў — перажывае адно цяжкае расчараванне за другім. Гэты свет у вялікай трывозе не толькі за сваю далёкую будучыню, але і за бліжэйшыя дні, за бліжэйшыя часы. Над гэтым светам навіс шэры змрок самай звычайнай безнадзейнасці, бесперспектыўнасці, гістарычнай асуджанасці. З кожным днём адкалваюцца ад гэтага свету ўсё новыя і новыя тэрыторыі, адыходзяць мільёны і мільёны людзей, далучаючыся да перадавога дэмакратычнага лагеру чалавецтва, адно ўпамінанне якога пазбаўляе сну і спакою сусветных захрыбетнікаў, даводзячы іх да роспачы, да шалёнай істэрыі, да страты розуму, да прыпадкаў бледнай немачы. Яны кідаюцца з адной безнадзейнай авантуры ў другую. Яны ліхаманкава ткуць павуцінне вайны, ствараючы розныя агрэсіўныя пакты, арганізуючы ваенныя базы, плацдармы, раскідваючы мільярды долараў на розныя «дапамогі», «падтрымкі» і г. д. Але рвецца павуцінне вайны. У пыл і прах разлятаецца яно пад магутнымі, асвяжаючымі вятрамі, якія дзьмуць над зямлёй, паступова ачышчаючы яе ад усякага бруду і нечысці.

І вось, калі сусветныя захрыбетнікі, гэтыя сучасныя прэтэндэнты на сусветнае панаванне, аказваюцца перад яўным паражэннем, перад яўным разбітым карытам, тады на некаторых з іх находзіць хвіліна часовага прасвятлення, калі пасля цвярозага роздуму яны здольны сказаць некалькі праўдзівых слоў. Вохкаючы і пацёркваючы пабітыя бакі, уздыхаючы аб сваіх няўдачах, яны не-не ды выціснуць разам з кракадзілавай слязой слова, другое аб сапраўдных прычынах сваіх няўдач. Мы маем на ўвазе апошняе выступленне Гувера, аднаго з самых крывяжэрных спярвятнікаў з чорнай зграі падпальшчыкаў вайны. Як і належыць чалавеку бізнеса, ён узяў у рукі лічыльнік і скрупулёзна падлічыў, колькі мільёнаў людзей стаяць на розных масівах: «сухапутным комуністычным» і тых масівах, якія яшчэ не выйшлі з-пад сферы капіталістычнага свету.

Лічыў, лічыў і да таго далічыўся, што ўсё яго выступленне стала падобным на вядомы біблейскі «плач на ріках вавілонскіх». Хаця зусім свядома і прапусціў ён сотні мільёнаў людзей, актыўных змагароў за мір, рэволюцыйна-вызваленчы рух у калоніях і шмат другіх, не зусім пажаданых для яго з'яў і рэчаў, але і тых лічбаў, на якіх спыніўся ён, аказалася даволі, каб упасці ў адчай. Вынікі падліку аказаліся вельмі і вельмі несуцяшальнымі і сумнымі для сучасных патрасальнікаў сусвету.

Аказваецца, як прыходзіць да вываду Гувер, што нічога не зробіш вайной з «сухапутным масівам», што любая спроба сунуцца туды з любога канца роўназначна вар'яцтву, што не бачыць ім, захрыбетнікам, Масквы, як сваіх уласных вушэй (быў адзін такі «герой», дык і той, сунуўшыся туды, не толькі вушы страціў, але і тое, на чым тыя асліныя вушы трымаліся).

Страціў Гувер і ўсялякую надзею на атамную бомбу і як ніколі ўвераваў у канчатковае паражэнне Злучаных Штатаў у Карэі. Праўда, ён абвінавачвае ў гэтым паражэнні Кітай, але тут-жа з цяжкім уздыхам павінен сказаць, што «ў свеце няма такіх узброеных сіл», якія маглі-б даць адпор гэтаму Кітаю.

Адкрыліся Гуверу ў часе яго прасвятлення і некаторыя другія горкія ісціны: амерыканская эканоміка стаіць перад суровай пагрозай катастрофы, у сатэлітаў няма адзінства, няма належнай духоўнай сілы і волі і што, самае галоўнае, «Амерыка не можа стварыць іх духоўную сілу. Мы не можам купіць іх на грошы». Адным словам, «плакали денежки!». Аказваецца, можна купіць бевінаў і шумахераў, адэнауэраў і жульмокаў, народа-ж не купіш. Акрамя таго, у гэтых непадкупных народаў, як аказваецца, ёсць «высокаарганізаваныя комуністычныя партыі», ёсць і яшчэ багата чаго, што не да спадобы гуверам, схільным разглядаць увесь свет, як падуладныя ім арызоны і аклахомы.

Да якіх-жа вывадаў прыходзіць Гувер? Не лезці ў безнадзейныя кампаніі, не паўтараць новыя Карэі. «... Мы павінны сказаць усю праўду і падрыхтавацца да трывожных часоў. Праўда непрыгожая. Мы сустракаем яе з малітвай і мужнасцю».

Наконт мужнасці спярвятнікаў мы, як гэта гаворыцца, замнём. А што датычыцца малітваў, то мы не супраць: маліцеся, калі ласка, містэр Гувер! Малітвы, па крайняй меры, занятак спакойны і бяскрыўдны, нават суцяшальны для разбойніка, асабліва, калі бачыць ён, што песенька яго ўрэшце рэшт праспявана.

Так сустракае Новы год стары аджылаючы свет, свет эксплаататараў, гвалтаўнікоў, разбойнікаў. Нічога новага, нічога светлага, нічога абнадзейваючага не абяцае ім Новы год. Гусцеюць змрокі над гэтым светам. Плесеняй, гніллю, тленам патыхае ад яго дэградуючай культуры. Звярыны рык першабытных джунгляў чуецца ў яго законах, у яго маралі, у яго звычаях і традыцыях. І гэтыя звярыныя джунглі нічым не прыкрыеш: ні словаблуддзем наёмных апалагетаў, ні кракадзілавай слязой, ні ханжаскімі ўздыханнямі і модламі, ні цьмяным мігценнем паблеклага долара.

Новы год нясе капіталістычнаму свету далейшае ўгасанне, далейшы распад яго эканомікі, яго культуры, усёй яго палітычна-дзяржаўнай сістэмы.

З глыбокай трывогай сустракаюць Новы год шырокія масы працоўных капіталістычных краін. Новы год азначае для іх далейшую інфляцыю, рост беспрацоўя, непамерны рост цэн на сродкі для жыцця, павышэнне падаткаў і розныя другія цяжары і нягоды, характэрныя для жыцця працоўнага чалавека ва ўмовах капіталістычнай рэчаіснасці. Але якім-бы цяжкім ні было жыццё працоўнага чалавека на Захадзе, ён ніколі не расстанецца з сваёй патаемнай марай, з сваёй палымянай надзеяй: стаць такім-жа свабодным, такімжа шчаслівым чалавекам, якім стаў працоўны чалавек на Вялікім Усходзе.

Новы год совецкія людзі сустракаюць, як слаўныя будаўнікі-пераможцы, як людзі крылатых дум і гераічных спраў, як смелыя пераўтваральнікі прыроды, як непахісныя змагары за мір. Сапраўды, колькі выдатных спраў адбылося ў нашай краіне за адзін толькі 1950 год! У пачатку года мы падпісалі дагавор з Кітайскай народнай рэспублікай.

У сакавіку ў нас адбылося новае зніжэнне цэн, што азначае далейшае паляпшэнне матэрыяльнага добрабыту совецкага чалавека.

У маі і ў чэрвені разгарнуліся дыскусіі па мовазнаўству, па вучэнню акадэміка Паўлава, з'явілася выдатная работа таварыша Сталіна «Адносна марксізма ў мовазнаўстве», якая стала магутным стымулам далейшага росту і развіцця перадавой совецкай навукі.

У жніўні ўвесь свет даведаўся, што больш 115 мільёнаў совецкіх людзей падпісалі Стакгольмскую Адозву ў абарону міру. А Другая Усесаюзная канферэнцыя прыхільнікаў міру! А актыўны ўдзел нашых дэлегатаў у Другім Сусветным кангрэсе барацьбы за мір! Усё гэта было сакрушальным ударам па падпальшчыках вайны. Усё гэта, разам з выступленнямі нашых дэлегатаў на Генеральнай Асамблеі Аб'яднаных Нацый, змяшала ўсе карты сучасных прэтэндэнтаў на сусветнае панаванне, зблытала іх планы, узмацніла сілы лагеру міру.

У гэтым годзе адбыліся ў нас выбары ў Вярхоўны Совет СССР і ў мясцовыя Советы. Выбары прадэманстравалі перад усім светам маналітнасць совецкага народа, беззаветную адданасць яго справе комунізма, сапраўдны росквіт дэмакратыі народаў нашай Радзімы, узросшую магутнасць социялістычнай дзяржавы.

У жніўні, верасні і снежні былі прыняты гістарычныя пастановы аб гіганцкіх сталінскіх новабудоўлях, ажыццяўленне якіх будзе найвялікшай у гісторыі перамогай чалавека над прыродай, на шчасце і добрабыт гэтага чалавека.

1950 год быў завяршаючым годам пасляваеннай сталінскай пяцігодкі. Штодзень нашы газеты прыносяць новыя і новыя весткі аб паспяховым выкананні планаў пяцігодкі, аб незлічоных перамогах совецкіх людзей у іх гераічнай і творчай працы.

Будуючы, творачы, смела гледзячы ў сваю сонечную будучыню, у комуністычнае заўтра, совецкія людзі не забываюць і свайго мінулага. Яны свята ахоўваюць усё лепшае, усё перадавое, што засталося нам у спадчыну ад нашых продкаў, што дапамагала нам і асвятляла шляхі нашай барацьбы за наш сённешні і заўтрашні дзень. Мы ўшаноўвалі нядаўна светлую памяць герояў «Слова аб палку Ігаравым», данёсшага да нас запаветы далёкіх продкаў: быць дбайнымі і пільнымі ў абароне нашай зямлі, нашай Радзімы.

Мы ўшаноўвалі гэтымі днямі памяць дзекабрыстаў, якія больш стагоддзя таму назад паўсталі супраць царскага самаўладства, супраць усяго, што затрымлівала рост краіны, што жалезнымі ланцугамі скоўвала творчыя сілы народа. Мы ўспаміналі палымяныя словы Пушкіна з яго паслання дзекабрыстам:

Во глубине сибирских руд
Храните гордое терпенье,
Не пропадет ваш скорбный труд
И дум высокое стремленье.

Мы ўспаміналі і прарочыя словы паэта-дзекабрыста Адаеўскага, напісаныя ім у адказ на пасланне вялікага Пушкіна:

... Наш скорбный труд не пропадет,
Из искры возгорится пламя...

Мы ўспаміналі таксама, што гэтыя словы «Из искры возгорится пламя» былі ўзяты Владзімірам Ільічом Леніным як эпіграф да першай агульнарускай марксісцкай газеты «Искра», першы нумар якой выйшаў у 1900 годзе, на самым пачатку пражытага намі паўстагоддзя. «Искра» дапамагла стварыць, арганізаваць баявую партыю пролетарыята, партыю, якая здолела ператварыць лепшыя мары народа, перадавыя думкі лепшых розумаў чалавецтва ў радасную і хвалюючую яву сучаснасці, у вялікую і ўсеперамагаючую справу комунізма.

Мы жывыя сведкі і непасрэдныя будаўнікі той эпохі, калі нязгасныя іскры ператварыліся ў вялікае ўсёачышчаючае полымя, калі сталінскае сонца азарае не толькі нашы шляхі, але і шляхі ўсяго працоўнага чалавецтва. Бессмяротныя ідэі комунізма — гэта той нязгасны светач, з якім прайшлі нашы народы ўсё мінулае паўстагоддзе, з якім сустракаюць яны Новы год новага паўстагоддзя.

Сустракаюць радасныя, шчаслівыя, упэўненыя ў сваіх сілах, у сваіх будучых перамогах, у няўхільных і рашаючых перамогах комунізма ва ўсім свеце.

Няхай-жа жыве Новы, тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят першы год!

У Прэзідыуме Вярхоўнага Совета СССР

Утварэнне Камітэта па міжнародных Сталінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі“

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР Указам ад 20 снежня 1949 года ўстанавіў міжнародныя Сталінскія прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі».

У адпаведнасці з гэтым Указам міжнародныя Сталінскія прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» прысуджаюцца штогод Камітэтам па міжнародных Сталінскіх прэміях, утвараемым Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР з прадстаўнікоў дэмакратычных сіл розных краін свету.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР, на падставе Указа ад 20 снежня 1949 года, утварыў 22 снежня г. г. Камітэт па міжнародных Сталінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі» ў саставе наступных прадстаўнікоў дэмакратычных сіл зарубежных краін і грамадскіх дзеячоў Совецкага Саюза:

Старшыня Камітэта — Скобельцын Дзмітрый Владзіміравіч — прафесар Маскоўскага Дзяржаўнага універсітэта, правадзейны член Акадэміі навук СССР;

Намеснікі старшыні Камітэта — Го Можо — прафесар, старшыня Усекітайскай асацыяцыі работнікаў літаратуры і мастацтва (Кітай), Арагон Луі — пісьменнік (Францыя);

Члены камітэта — Андэрсен-Нексе Марцін — пісьменнік (Данія), Бернал Джон — прафесар Лонданскага універсітэта (Англія), Дэмбоўскі Ян — прафесар Лодзінскага універсітэта (Польшча), Келерман Бернгардт — пісьменнік (Германія), Маркезі Канчэто—прафесар універсітэта ў Падуі, дэпутат парламента (Італія), Неруда Пабло — пісьменнік (Чылі), Садавяну Міхаіл — пісьменнік, акадэмік (Румынія), Фадзееў Аляксандр Аляксандравіч — генеральны сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў, Эрэнбург Ілья Грыгор'евіч — пісьменнік.



Г. БРЖАЗОЎСКІ. «Н. М. Швернік на заводзе імя Кірава».

Запаветныя думы

★

Пятрусь БРОЎКА

★

Думкі кожнага совецкага чалавека сёння аб тым, як сваёю працаю найбольш дапамагчы велізарнаму будаўніцтву Радзімы. Калі-б можна было адным паглядам ахапіць неабсяжныя прасторы нашай совецкай краіны, дык мы пабачылі-б поўны захаплення велічны малюнак усенароднай будоўлі. На поўначы і на поўдні, на захадзе і ўсходзе — усюды совецкія людзі пад кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна—Сталіна будуюць заводы і фабрыкі, узнімаюць социялістычны ўраджай, узводзяць новыя гарады, ствараюць цудоўныя палацы інстытутаў, тэатраў, школ.

Мірная стваральная праца — вось што сягоння ў сэрцы кожнага совецкага чалавека. Мы добра бачым вынікі сваёй гераічнай работы за пасляваенныя гады.

Як хутчэй, як лепш і прыгажэй будаваць, — вось аб чым сёння дума ў нашых людзей. Яны абменьваюцца вопытам з сябрамі, дапамагаюць адзін другому. Будаўнікі Мінска спаборнічаюць з будаўнікамі Сталінграда, горада-героя, яны цікавяцца аднаўленнем сталіцы Польшчы — Варшавы, сочаць за будаўніцтвам Крэшчаціка ў Кіеве, за тым, як залечыў раны пасляваенны Ленінград. І куды-б сёння ні глянулі мы, усюды пабачым рыштаванні на новых будоўлях, нанова ўзнікшыя фабрыкі і заводы, новыя каналы, бясконцыя лясныя палосы, а над усім гэтым узнімаюцца закладзіны магутных будоўляў комунізма, якія з'яўляюцца вянцом нашых дасягненняў, будоўляў, што ствараюцца па ўказаннях нашага любімага правадыра — вялікага Сталіна.

Людзі добрай волі ўсяго свету бачаць, чым жыве наш Совецкі Саюз. На канферэнцыі прыхільнікаў міру ў Маскве выступаў старшыня Англійскага камітэта абароны міру Кроўтэр. Вось аб якіх уражаннях расказаў ён дэлегатам:

«Калі я ляцеў у Маскву ў ноч перад нядзеляй, паветра было спакойнае і неба было вельмі чыстае. Угары бліскалі тысячы зор, а знізу тысячы агнёў. Зяянне святла над Масквой было відаць, калі да горада было далёка. Калі мы наблізіліся, можна было разгледзець асобныя сузор'і агнёў і, у прыватнасці, сталі відаць вельмі яркія агні нейкага высокага будынка, якога я не мог пазнаць.

Хутка мне стала вядома, што гэта быў уноў будуемы высотны будынак Маскоўскага універсітэта на тым самым месцы, на Ленінскіх гарах, дзе я быў год назад, і работа толькі яшчэ пачыналася.

Ці не гэта адказ совецкіх людзей на пытанне аб тым, што яны думаюць пра мір і пра вайну. Чым заняты совецкія людзі ў той час, калі свет поўны ваенных пагроз і войны ўжо вядуцца ў розных частках свету? Яны з нябачанай раней хуткасцю будуюць найвялікшую групу універсітэцкіх будынкаў.

А што ў гэты час робіць генерал Макартур? Я пытаюся ў вас, я пытаюся ва ўсіх мужчын і жанчын свету, хто-ж з'яўляецца агрэсарам: ці тыя, хто будуе універсітэты, ці тыя, хто кідае бомбы на грамадзянскае насельніцтва ў Карэі?»

Вось як гаворыць аб сапраўдным становішчы на свеце людзі добрай волі ўсяго свету.

Растуць нашы гарады. Будуюцца заводы. А калгасныя людзі ўсе свае сілы аддаюць на ўздым ураджайнасці палёў. З кожным годам павялічваюцца рады майстроў социялістычнай гаспадаркі. Кожны з нас, дзе-б ён ні працаваў, заўсёды сваю працу звязвае з думаю аб міры, бо адзіная дума ў нас, як больш зрабіць, як захаваць здабытае для саміх сябе і сваіх дзяцей. Мне нядаўна давялося быць на вопытнай гаспадарцы ў Лошыцы пад Мінскам. З агратэхнікам Аляксандрай Георгіеўнай Душчынскай мы аглядалі гаспадарку і гаварылі пра жыццё. І калі Аляксандра Георгіеўна апавядала аб сваёй рабоце, першыя яе словы былі аб міры:

— Мір — гэта значыць жыць і ствараць. Вось у мяне невялікі ўчастак работы — ягадныя культуры нашай гаспадаркі. Мая справа простая — думаць і працаваць так, каб пазёмкі і маліна былі буйнейшымі. Вопыт —вялікая справа, а ён у цас асноўнае. На практыцы я знайшла, што торф, перамешаны з гноем,—лепшае ўгнаенне для ягадных культур. Вельмі важна ўнесці ўгнаенне ў свой час. У гэтым годзе мне ўдалося атрымаць 10—12 тон пазёмкі з гектара. Знайсці новае, палепшыць жыццё на зямлі, хіба не ў гэтым радасць міру?

— Вы гаворыце пра мір, а я, ведаеце, як яго ўяўляю, — кажа мне Аляксандра Георгіеўна:

— Мір, як велізарны сад. Вось я, бывае, адпачываю дома, заплюшчу вочы і мне здаецца, як ідуць і ідуць па палях Беларусі дрэўцы, выгадаваныя ў нашых пітомніках, як становяцца яны каля новых калгасных пасёлкаў і буйным красаваннем ахапляюць зямлю. Сярод іх і мае ягаднікі. Вось за такі мір я хачу ўсім сэрцам змагацца.

Так думаюць сёння аб жыцці ўсе нашы людзі. А ў велічных будоўлях комунізма мы бачым завяршэнне самых высокіх нашых мараў.

Але інакш думаюць імперыялісты свету, асабліва амерыканскія. Ім не да спадобы, каб людзі на свеце жылі вольна, каб людзі выходзілі з-пад іх прыгнёту. Вось чаму яны ўсімі сіламі хочуць развязаць новую вайну. Браніраваным страшыдлам кінуліся яны на Карэю, каб затаіць яе ў крыві. Яны бамбяць і гарады Карэі, яны зноў арганізоўваюць гітлераўскіх малойчыкаў. Але як ні палохалі капіталісты, яны ўжо атрымалі па зубах. Карэйскі народ разам са сваімі кітайскімі сябрамі гоніць бандытаў з карэйскай зямлі.

Не ўдасца Трумэну сесці народам на спіны. Супроць яго пагроз развязаць новую сусветную бойню ўсталі ўсе людзі добрай волі свету. На чале іх — наш магутны Совецкі Саюз, а ўперадзе ўсіх выдатны сцяганосец міру — вялікі Сталін!

Ніхто не здолее перашкодзіць нам пабудаваць комунізм — здзейсніць мару ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва свету.

А комунізм — гэта вечны мір і шчасце на зямлі!

Заўсёды з табой, правадыр!

Праз бітвы, паходы і маршы,
Вялікіх змаганняў гады,
Высока сцяг Леніна ўзняўшы,
Мы йшлі за табой, правадыр!

Ішлі і не ведалі зморы
Ні цёмнаю ноччу, ні днём,
А зоры, Крэмлёўскія зоры
Наш шлях залівалі святлом.

Да слаўнай прыйшлі перамогі
І, шчыльна з'яднаўшы рады,
Пайшлі мы працоўнай дарогай
З табой, дарагі правадыр!

...І шэпчацца рунь маладая,
Квітнеюць сады і палі,
І песня «Ад краю да краю»...
Гучыць па радзімай зямлі.

З руін узрастаюць палацы,
Над імі звіняць правады...
Да поспехаў творчае працы
Прыйшлі мы з табой, правадыр!

І сёння ў паходзе працоўных
За волю, за шчасце, за мір
Ідзем мы у першых калонах,
І ты нас вядзеш, правадыр!

Алесь ГАРЗЛІК.

Першы трактар

Нядаўна ў рамцы быў пад шклом
На чарцяжы, і вось той самы
Наш трактар пыхнае дымком,
І рушыць ад заводскай брамы.

Выходзіць гулка ён у свет
Па вуліцы Трактараграда,
Па сцежках гусеніц услед
Ідуць канструктары ў халатах.

Ідуць дзяўчаты, юнакі,
Што важкія яго дэталі,
Ужо асвоіўшы станкі,
Выточвалі і шліфавалі.

Вітаюць творцаў муляры
На ўскраіне са сцен паверхаў,
Прыгадваюць, як у бары
Закладвалі падмуркі цэхаў.

А трактар шляхам баравым,
Гатовы к ворыву, з прычэпам
У поле выйшаў, і за ім
Плыве ў чатыры хвалі глеба.

Курыцца пара ад зямлі,
І звоняць жаўранкі бадзёра,
Ступаюць творцы ўздоўж раллі,
Гудзенне слухаюць матора.

Ідуць смялей, за кругам круг—
У трактары усё да ладу.
І сіла ёсць —не толькі ў плуг,
Запрэгчы можна і ў гармату.

Але вядома, ў МТС
Служыць ён пойдзе неўзабаве,
Араць зямлю, вывозіць лес
І засяваць палі дзяржаве.

На сэрцы радасна ад спраў —
Узняўся горад светлых цэхаў
Такім, як правадыр сказаў,
Калі з вайны праз Мінск ён ехаў.

Аляксей РУСЕЦКІ.

Людзі і час

★

Кастусь ГУБАРЭВІЧ

★

Хто не памятае тую ўрачыстую хвіліну, калі Крэмлёўскія куранты спакойнымі ўдарамі адлічваюць апошнія секунды старога года!

За гэтыя секунды перадумаеш часам больш, чым за якія-небудзь дні і тыдні. Мімаволі хочацца азірнуцца назад і паглядзець, што зроблена табой за мінулы год, ці з чыстым сэрцам і сумленнем за свой абавязак перад народам і Радзімай пераступаеш ты парог Новага года?

Асабліва чыстым і высокародным гэтае пачуццё самаправеркі будзе ў дзесяткаў тысяч людзей, якія ствараюць станкі, машыны, трактары, лакамобілі, сеялкі, малатарні, ствараюць індустрыяльную чэсць нашай рэспублікі. За іх плячыма астаўся год вялікіх спраў і яшчэ больш вялікіх намаганняў зрабіць за адзін год тое, што планавалася на некалькі гадоў. Многія нашы заводы і фабрыкі датэрмінова выканалі свае гадавыя планы і ўжо ў мінулым годзе працавалі ў лік 1951 года. З чаго складаўся поспех гэтых прадпрыемстваў? Адным з важнейшых элементаў іх перамогі былі людзі, якія творча падыходзілі да вырашэння задач пасляваеннай пяцігодкі. Сярод іх з кожным днём усё большае і большае месца пачынаюць займаць так званыя скораснікі — паслядоўнікі вядомага ленінградскага токара Барткевіча.

Ідэя скораснай апрацоўкі метала дзўно ўжо выспявала ў нетрах совецкага рабочага класа. Нашы токары і фрэзероўшчыкі, ад якіх заўсёды залежыць выкананне вытворчых планаў, не раз думу думалі, каб паскорыць апрацоўку метала, бо гэтае паскарэнне дасць краіне тысячы звышпланавых станкоў, машын, трактароў, паравозаў і інш.

І вось, першы з іх — токар Барткевіч даводзіць на сваім станку хуткасць абточкі да 700—800 метраў у хвіліну замест існаваўшай нормы 90—100 метраў. Наколькі наспеўшай была гэтая наватарская ідэя, відаць ужо хоць-бы з таго, што амаль адначасова з Барткевічам лепшыя токары Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава таксама знаходзяць прынцып скораснай абточкі. Гэты наватарскі патрыятычны пачын веснавой паводкай разліўся па Совецкай Радзіме і не мог не абудзіць творчую ініцыятыву тысяч рабочых нашай рэспублікі. Напярэдадні Новага года ў Мінску была праведзена рэспубліканская канферэнцыя скораснікаў. З Магілёва, Віцебска, Гомеля, Ліды і другіх гарадоў рэспублікі прыехалі токары, фрэзероўшчыкі, інжынеры, тэхналагі. Пераважную большасць канферэнцыі складалі мінчане — наватары аўтамабільнага, трактарнага, станкабудаўнічага заводаў, завода імя Варашылава. Уласна кажучы, гэта нельга было назваць ні канферэнцыяй, ні злётам, ні нарадай, як разумеем мы іх у звычайным сэнсе. Гэта была калектыўная ўзаемаправерка, а хутчэй за ўсё — асэнсаванне таго вопыту, які быў набыты на прадпрыемствах рэспублікі за апошні час.

Мяркуючы па тым, з якім пранікненнем і ўвагай слухалі ўдзельнікі гэтай канферэнцыі адзін другога, можна было адчуць, што скораснікі Беларусі даўно ўжо хацелі сустрэцца, каб навучыцца лепшаму вопыту перадавікоў.

На трыбуну адзін за другім узнімаюцца токары, фрэзероўшчыкі, тэхналагі і замест «дакладаў» расказваюць, як яны ў сябе, на сваіх заводах, на сваіх станках удасканальваюць і паглыбляюць скорасныя метады. Токар Гомельскага станкабудаўнічага завода тав. Дзівін, перад тым як пазнаёміць аўдыторыю са сваімі дасягненнямі, развесіў чарцяжы і схемы, якія наглядна паказалі шлях яго творчых пошукаў. Ён прывёз з сабой удасканаленыя ім разцы і паказаў іх удзельнікам канферэнцыі. Разцы павышанай устойлівасці паскорылі працэс апрацоўкі. Калі раней на апрацоўку вінта затрачвалася 13 гадзін, дык зараз токар Дзівін спраўляецца з гэтай аперацыяй за дзве гадзіны.

Справа тут не ў тым, што токар віртуозна авалодаў усімі вядомымі прыёмамі сваёй прафесіі, а ў тым, што ўзбагаціў іх яшчэ невядомымі, знойдзенымі самім ім прыёмамі і метадамі. Гэта першая і адметная рыса чалавека заўтрашняга дня, пачатку комунізма, калі прафесія пераходзіць у творчасць, адчувалася ў кожным удзельніку канферэнцыі.

Толькі два гады назад пазнаёміўся са сваёй прафесіяй тав. Сакалоў, токар Лідскага завода сельскагаспадарчых машын, а як рэзка змяніў ён суадносіны часу ў сваім цэху ў выніку творчага пераасэнсавання метадаў апрацоўкі чыгуну! Калі раней адзін корпус машыны абточвалі за тры змены, дык цяпер абточваюць тры карпусы за адну змену.

На трыбуну ўзышоў хлапец, па ўсяму відаць, — нядаўні рамеснік. І сапраўды, скончыў ён вучылішча толькі ў 1948 годзе. І вось ужо трэці год токар Маладцоў працуе на Мінскім заводзе імя Варашылава. Калі ён пачаў гаварыць аб скорасніках свайго завода, хтосьці спытаў яго, хто-ж на заводзе лічыцца самым першым скораснікам? Хлопец пачырванеў, змоўк і пэўна-б прамаўчаў, каб не падказаў нехта з яго адназаводцаў:

— Ды ён-жа і ёсць наш першы скораснік!

І вось, 19-гадовага знатнага мінскага токара ўважліва слухалі не толькі простыя рабочыя, але і інжынеры, і тэхналагі, падрабязна запісваючы ў свае блакноты ўвесь ход творчых пошукаў, што прывялі яго да выдатнейшай перамогі. Токар Маладцоў давёў хуткасць рэзання метала на сваім станку да 400 метраў за хвіліну! Ён узначальвае на сваім заводзе скорасны ўчастак і выканаў у чэсць выбараў у мясцовыя Советы дзве з паловай гадавыя нормы.

Токар тав. Пасаманаў з Віцебскага завода імя Комінтэрна расказаў сваім таварышам-скораснікам, як ён дамогся яшчэ большай перамогі, выканаўшы за чатыры з паловай гады пятнаццаць гадавых норм. Просты токар, ён гаварыў аб сваіх творчых і рабочых працэсах мовай інжынера. Між іншым, Пасаманаў у гэтым сэнсе быў не выключэннем. Кожны, хто ўзыходзіў на трыбуну канферэнцыі, гаварыў мовай чалавека, які глыбока разбіраецца ў тэхнічных пытаннях і праблемах сваёй складанай прафесіі і разбіраецца настолькі, што, напрыклад, гомельскі токар тав. Дзівін даволі грунтоўна паправіў аднаго тэхнолага буйнога мінскага завода.

Так паступова сціраюцца грані паміж рабочым і інжынерам і нараджаецца сёння новы тып рабочага, тэхнічна адукаванага, тып наватара-творцы, шукальніка новых тэхнічных ідэй, законаў, у параўнанні з якімі старыя законы становяцца ўжо анахранічнымі, а часам і шкоднымі. Бытавала-ж «тэорыя», што скорасная апрацоўка метала можа знізіць якасць паверхні дэталі, а скораснікі на практыцы даказалі абсурднасць гэтай «тэорыі». Кандыдат тэхнічных навук тав. Якаўлеў тэрэтычна даказаў удзельнікам канферэнцыі, што высокая тэмпература метала пры скораснай апрацоўцы не паніжае, а павышае якасць не толькі паверхні, а разца.

Так узбагачаецца і навука вопытам рабочых-наватараў.

Скорасная апрацоўка. Сёння яна яшчэ— справа наватараў, заўтра яна будзе здабыткам усіх рабочых. Калі яшчэ нітак даўно скораснікі былі адзінкамі, дк сёння іх сотні, сёння на перадавых водах рэспублікі ёсць скорасныя ўчасці, заўтра будуць скорасныя цэхі, а з гэтым часу скорасныя станцуць цэлыя воды.

Яві абганяюць час. Тое, што планавала на пяцігодку, наватары-скораснікі выконваюць за тры-два гады, а то і за г

Мгія з іх сустракаюць і будуць сустрэць кожны Новы год, як каляндную дату, а свой працоўны Новагод яны ўжо абагналі. Таму з асаблівай радасцю будуць слухаць нашы стахаўцы бой маскоўскіх курантаў. У гэя секунды сваімі думкамі і справамі яны будуць на пяць год упередзе і так хочацца сказаць ім:

З вым 1956 годам вас, таварышы!

Наша пяцігодка

◆

Іван ГРАМОВІЧ

◆

Пасляваенная пяцігодка — гэта не толькі адноўленыя заводы, новыя прадпрыемствы, чыгункі, электрастанцыі, дамы; гэта перш за ўсё новыя людзі, наватары прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Іх вельмі шмат, яны выраслі так прыкметна, што кожны ведае іх справы.

Наша пяцігодка—гэта росквіт талентаў, якіх багата ў народзе. У першы год пасляваеннай пяцігодкі пра Міхася Антоніка яшчэ мала хто чуў у цэхах трактарнага завода. Муляр Лявон Банны таксама яшчэ вучыўся ў лепшых майстроў. Яшчэ нядаўна паслядоўніцы знатнага інжынера Ф. Кавалёва, стаханаўкі Мінскага тонкасуконнага камбіната Вольга Сумарава і Вольга Войніч дасягнулі поспехаў у сваёй рабоце. Героі социялістычнай працы нараджаліся штодзённа на працягу ўсёй пяцігодкі. Разам з ростам будаўніцтва раслі і новыя людзі.

Наша большэвіцкая партыя паставіла перад працоўнымі задачы, якія запісаны ў пяцігадовым плане, і працоўныя імкнуліся як найхутчэй выканаць гэтыя задачы. Праца для іх з'яўляецца справай доблесці і геройства. У гэтым сакрэт перамогі совецкіх людзей.

Пяцігадовы план прадугледжваў механізацыю працы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, прадугледжваў забеспячэнне магчымасці рабочым павышаць сваю кваліфікацыю. І вось, абапіраючыся на навуку, на вопыт перадавікоў, за самы кароткі час выраслі народныя таленты.

— Памятайце, што без навукі ўраджаю не вырасціш, — гаворыць Герой Социялістычнай Працы Праскоўя Калола, — пачынаць трэба з вучобы, з агратэхнікі...

Электразваршчык Міхась Антонік па зыркасці полымя адчувае сілу току, якую трэба ўмець рэгуліраваць пры сшыванні лістоў жалеза. Ён гэта ўмецце набыў дзякуючы вопыту, вычытаў пра яго з кніг па электратэхніцы.

Пяцігодка — гэта вялікае вытворчае наступленне, на пярэднім краі якога ідуць стаханаўцы, сталінская гвардыя рабочага класа. Яны і ў нашай рэспубліцы, як і ва ўсёй краіне, далі бліскучыя ўзоры працы, выканаўшы па 12—15 норм за гэту пяцігодку. Такімі людзьмі славен не толькі Мінск, але і Гомель, Магілёў, Віцебск...

Як-ж характэрная рыса ў натуры гэтых людзей? Калі мы бяромся за ручку, каб пісаць аб іх апавяданне, трэба ўспомніць словы майстра Маскоўскага завода «Калібр» Нікалая Расійскага, які аб сказаў:

—Нам цяпер лёгка працаваць... На першпогляд гэта гучыць дзіўна: людзей я самая колькасць, тэхніка больш складная, заданне павялічылася ў дзесяцьзоў, а працаваць лягчэй. Чаму гэта?» Людзі сталі пісьменнымі, квалфіцыраванымі. Механізацыя і аўтаматызацыя цясняюць ручную працу. Рабочыя не гаюць з канца ў канец цэха пяжкія рыкі з дэталямі... Ды гэта яшчэ і не ае галоўнае. Справа не толькі ў гымто лягчэй стала працаваць — зрабілася куды цікавей. Мы ўвесь час адчуваемябе так, быццам мы ў палёце, і намадкрываюцца ўсё новыя і новыя даляды, новыя мары... Так, мары! Не ведае магчыма, мы дарацыяналізуемся да о, што ўвесь працэс вырабу мікромет будзе праходзіць аўтаматычна...

Ахнаўская праца — гэта неабсяжныя далягляды. Яна адкрывае нам той шл на якім толькі і можна дасягнуць сфіня супрацьлегласці паміж працай разовай і працай фізічнай.

Я. ЗАЙЦАЎ. «Абарона Брэсцкай крэпасці».

Ля варот горада

Рыгор НЯХАЙ

— Вы думаеце, што дзяжурыць пры дзвярах на вакзале, гэта проста так. Прастаяў змену, ды і найшоў сабе. Не, таварыш! Вось заўтра Новы год сустракаецца. А я — на дзяжурстве. Значыцца, мой абавязак — прыезджага пасажыра з Новым годам павіншаваць і пажадаць яму шчасця.

— Віншую вас, грамадзянін, з Новым годам, з новым шчасцем! Хай ажыццявіцца, што хто задумаў. А задумалі мы ўсе адно: каб вайны не было...

Дома ў мяне дачка малая. Я ёй ёлку паставіла. А пасля дзяжурства падарункі ёй прынясу.

З усіх канцоў дзень і ноч прыходзяць і адыходзяць цягнікі. Колькі розных людзей прыбывае ў нашу сталіцу. Хто тут спыняецца, а хто праездам. Мы, можна сказаць, адчуваем сябе гаспадынямі горада: павінны прыняць і правесці пасажыра, як госця. Культурна сустрэнем, гасцінна — ва ўсе канцы добрая слава пойдзе пра наш горад: «Вось у Мінску якая культура, які народ!..» А будзеш так проста адносіцца, слова ветлівага не прамовіш чалавеку — усім нам сорамна будзе. Так што наш пост не абы-які.

Вось група афіцэраў з брэсцкага цягніка накіроўваецца па вакзал. Напэўна, едуць дадому ў адпачынак. А са мной яшчэ здалёку вітаюцца:

— Прывітанне, сястра! У буфет як прайсці?

— Калі ласка. Вось сюды, налева!

Незабыўныя сустрэчы бываюць. Нядаўна дэлегаты Другога Сусветнага кангрэса прыхільнікаў міру ехалі з Варшавы. Нашы совецкія, кітайскія, карэйскія дэлегаты. Ну, тут, я думаю, любы захацеў-бы стаць на маё месца. Гэта вам не жартачкі, такіх пасланцоў сустракаць. А я стаю ўсё і думаю, каб перад гасцямі сорамна не было. Цягнік тут нядоўга стаіць: далёка не пойдуць. А на вакзал заглянуць. Ага! Вось яны ўжо ідуць. Я дедзьве паспяваю адказаць на прывітанні. Не жартачкі — тут і вучоныя, і пісьменнікі, і героі ёсць. І нашы, масквічы, і людзі з далёкіх прыязных краін. Сярод іх і жанчыны. Вось карэйская дэлегатка Пак Дэн Ай. Я чытала пра яе выступленне. Ад сэрца яна гаварыла, нездарма яе на кангрэсе на «ура» паднялі.

— Жадаю вам, дарагая сястра, хутчэйшай перамогі над інтэрвентамі...

Вакзал наш дэлегатам спадабаўся.

Бываюць такія выпадкі, што далёкі пасажыр тут на паўсуткі, ці на суткі спыняецца, і, вядома, у мяне пытае:

— Як прайсці, каб агледзець цэнтр горада, лепшыя кварталы і будынкі?

Я тут нібы ўжо экскурсавод, падрабязна пра ўсё расказваю:

— Прайдзіце па вуліцы Карла Маркса да будынка ЦК, а потым павярніце да Дома афіцэраў. Не забудзьцеся паглядзець бібліятэку імя Леніна і купалаўскі тэатр. Адтуль відаць парк, Круглая плошча, оперны тэатр. А потым пайдзіце па Совецкай, паўз Дом урада аж да Заходняга маста. Гавару я так і думаю: на першы раз чалавеку ўражанняў хопіць. Нельга загружаць адразу. А калі мала, у мяне ёсць яшчэ ў запасе маршрут да аўтазавода.

— Ад Заходняга маста можаце сесці на трамвай і ехаць проста на вакзал адпачываць у пакой для транзітных пасажыраў. А калі не стаміліся, прайдзіце пешшу па прывакзальным бульвары. Дарэчы, і Універсітэцкі гарэлок пабачыце...

Так і ёсць: пасажыр вельмі задаволены, вярнуўшыся дзякуе. Кажа: «Чытаў я пра Мінск не раз, а калі пабачыў, ніколі не забуду».

Самая важная для нас катэгорыя пасажыраў — гэта майстры і спецыялісты, якія прыязджаюць да нас з другіх рэспублік і гарадоў жыць і працаваць на мінскіх новабудоўлях. Ім — асаблівая павага. Дзверы нашага горада перад імі шырока раскрыты.

Я яшчэ хацела расказаць аб самым галоўным, аб тым, што мы заўсёды будзем з радасцю ўспамінаць і ніколі не забудземся... Гэта—пра нашага любімага дэпутата Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Было гэта ў мінулыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР. Увесь Мінск, як адзін чалавек, разам з імем нашага дарагога правадыра Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна зноў назваў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета імя нашага любімага дэпутата Клімента Ефрэмавіча Варашылава. Свята было тады на нашых вуліцах, ды і ўсюды, куды ні пайдзі. Усе з сардэчнай радасцю, з гонарам гаварылі, што таварыш Варашылаў даў згоду балатыравацца ў дэпутаты па Мінскай выбарчай акрузе.

Ну, думаем, хто-хто, а мы першымі сустрэнемся з нашым любімым кандыдатам. Яно так і вышла. Калі мы даведаліся, што Клімент Ефрэмавіч вось-вось павінен прыехаць на сустрэчу са сваімі выбаршчыкамі, радасці не было канца. Вялікая чэсць стаяць на пасту выпала мне.

Цягнік падыйшоў да перона. Стаю я і вачэй не зводжу, з якога-ж вагона выйдзе Клімент Ефрэмавіч? А ён з'явіўся нечакана. І проста падае мне руку:

— Прывітанне нашай беларускай жанчыне!

Так па-беларуску і сказаў.

Я так разгубілася, што і не запомніла, як ён апрануты, які з выгляду. Але яшчэ і цяпер адчуваю гэты гарачы поціск рукі.

Дзяўчаты мяне потым дармашылі:

— Ну, расказвай, як там было!.. Які ён, ды ўсё такое. Я, зразумела, як на партрэце бачыла, так і расказала, а асабліва аб прастаце яго, аб сардэчнасці. Доўга мы не маглі супакоіцца. А на выбарах усе дружна аддалі за яго свае галасы. І дамовіліся, калі будуць новыя выбары, абавязкова ізноў вылучым сваім кандыдатам Клімента Ефрэмавіча.

Прабачце, што так многа расказваю. Рэдка да нас заглядваюць пісьменнікі. Відаць, думаюць: ат, што там за работа такая — стаяць пры дзвярах на вакзале... Дык я ўсё хачу расказаць па-парадку. Ёсць у нас і недахопы. Вось прыгарадныя пасажыры часта на нас крыўдзяцца. Трэба прыгарадны вакзал будаваць. Гэта праўда.

Адным словам, спраў у нас хапае, гэта не тое, што ў канцылярыі над паперкамі сядзець. Тут заўсёды з людзьмі і між людзей. Думаць прыходзіцца, вучыцца, каб умець з кожным пагаварыць — і з вучоным і з малапісьменным чалавекам. І сам не заўважаеш, як расцеш і сталееш.

* * *

Так спачатку сарамліва, а потым смялей і смялей апавядала мне пра сваю работу дзяўчына ў чыгуначным шынялі і цёмным берэце, з-пад якога выбіваліся кучаравыя русыя валасы...

Я запісаў усё па-парадку ў свой блакнот.

На вялікай будоўлі

Уладзімір КАРОЛЬ,
мастак-архітэктар

Шырокім фронтам разгарнулася будаўніцтва ва ўсіх кутках Совецкай Беларусі. Рэспубліка ўяўляе сабой будаўнічую пляцоўку, на якой аднаўляюцца і рэканструюцца гарады і вёскі. Гэта вялікая агульнанародная будоўля пачалася з першых дзён вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Архітэктары і будаўнікі следам за часцямі Совецкай Арміі ўваходзілі ў вызваленыя ад акупацыі гарады і пачыналі аднаўленне заводаў і кватэр, тэатраў і дзіцячых устаноў, будаўніцтва новых магістраляў, рэканструкцыю гарадской гаспадаркі, азеляненне вуліц і плошчаў. Задачы былі велізарныя.

У праектаванні генеральных планаў гарадоў рэспублікі прымаў удзел вялікі калектыў беларускіх архітэктараў і інжынераў, спецыялісты Масквы і іншых гарадоў Совецкага Саюза. Большасць гарадоў Беларусі маюць ужо сёння генеральныя планы адбудовы і рэканструкцыі.

Будаўніцтва Мінска вядзецца па генеральнаму плану. Забудова новых раёнаў, кварталаў, магістраляў і вуліц ажыццяўляецца строга па плану з перспектыўным улікам комплекснага вырашэння вялікіх градабудаўнічых задач. За невялікі тэрмін у Мінску створаны буйныя ансамблі, якія ўжо ў многім вызначаюць новае архітэктурнае аблічча беларускай сталіцы. Праводзіцца максімальная канцэнтрацыя будаўніцтва і добраўпарадкавання. Пастаўлена задача ў першую чаргу комплексна забудаваць і добраўпарадкаваць цэнтральны раён горада з галоўнай магістраллю — Совецкай вуліцай і іншыя важнейшыя магістралі і раёны новай буйнай прамысловасці. Гэты прынцып распаўсюджваецца і ў будаўніцтве Гомеля, Віцебска, Магілёва і іншых гарадоў рэспублікі.

У 1951 год мы ўступаем узброенымі багатым вопытам аднаўлення гарадоў і вуліц, пабудовы прамысловых гігантаў і гарадскіх ансамбляў.

У Мінску адначасова з такімі буйнымі пабудовамі, як жылы дом гарадскога Совета (паміж вуліцамі Урыцкага і Валадарскага) з вялікім кінатэатрам на першым яго паверсе, жылы дом аўтазавода, будынак Палаца культуры профсаюзаў, будынак Дзяржбанка, паштамта, шырока разгорнецца будаўніцтва на працягу ўсёй магістралі. У раёне Цэнтральнай плошчы будзе пабудаваны вялікі жылы дом Міністэрства электрастанцый. Па Ленінскай вуліцы ў кірунку плошчы Свабоды — жылыя дамы Міністэрстваў лёгкай і мясамалочнай прамысловасці.

З пабудовай гэтых дамоў вызначацца габарыты Цэнтральнай плошчы, якая будзе адпаведным чынам афармлена і падрыхтавана для ўстаноўкі ў цэнтры яе скульптурнага манумента таварыша Сталіна, над стварэннем якога цяпер працуюць віднейшыя скульптары Масквы і Мінска. На рагу Совецкай вуліцы і вуліцы Янкі Купалы пачнецца будаўніцтва 8-павярховага жылога дома, які з'явіцца часткай вялікага комплекса, арганічна звязанага з паркам, і вызначыць у гэтым месцы маштаб і веліч праспекта. Ля Круглай плошчы, паміж вуліцамі Фрунзе і Захарава разгорнецца будаўніцтва жылых дамоў гарадскога Совета з выхадам галоўных фасадаў на Совецкую вуліцу.

Забудова гэтай часткі мае вялікае градабудаўнічае значэнне ў вырашэнні архітэктуры ўсяго раёна ў сэнсе паступовага пераходу да парка і стварэння архітэктурнага асяроддзя для ўстаноўкі ў цэнтры плошчы велічнага помніка воінам Совецкай Арміі і беларускім партызанам, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне. На рагу вуліц Совецкай і Даўгабродскай пачнецца будаўніцтва жылога дома трактарнага завода, вуглавая частка якога ў выглядзе 10-павярховай вежы будзе самай значнай сілуэтнай вышынёй па Совецкай вуліцы. Будаўніцтва іншых дамоў на падыходах да Совецкай вуліцы павінна яшчэ больш падкрэсліць сілуэт горада і яго новую структуру.

Многа цікавага і значнага будзе зроблена ў галіне азелянення і добраўпарадкавання горада. У 1951 годзе прадоўжыцца пасадка дрэў у дзіцячым парку і ў парку, які размешчаны ў раёне тэатра оперы і балета. Пабудова фантанаў на алеях, якія вядуць да тэатра, увядзенне партэрнай зеляніны, устаноўка асвятляльных вежаў яшчэ больш упрыгожаць гэтае месца горада. Пачнуцца пасадкі ў парку «30-годдзе БССР», будзе пашырана ў гэтым месцы рака Свіслач і пабудаваны новы мост. Будзе праведзена добраўпарадкаванне парка імя Горкага, у прыватнасці каля будынкаў цырка, кінатэатра і ў раёне дзіцячага сектара. У раёне трактарнага завода будзе закладзены парк культуры і адпачынку з комплексам спартыўных і відовішчных пабудоў.

Зялёны дыван на тратуарах па Совецкай вуліцы, які падкрэслівае лінію дрэў, будзе абнесены нізкім плотам з керамікі і засаджаны па перыметру наборам жывых кветак, што створыць надзвычай цікавы малюнак усёй вуліцы. Мяркуецца пашырэнне парка каля стадыёна «Дынамо» да вуліцы Свярдлова.

Будзе прадоўжана рэканструкцыя Прывакзальнай плошчы. Тут размесцяцца скверы з фантанамі і асвятляльнымі вежамі.

Гэты, дарэчы далёка не поўны, пералік па капітальнаму будаўніцтву і добраўпарадкаванню горада ўскладае вялікую адказнасць на будаўнікоў і архітэктараў.

Поспех будаўнічых работ 1951 года будзе залежаць і ад таго, як хутка мы здолеем ліквідаваць тыя хібы, якія былі ў нашай градабудаўнічай практыцы ў гэтым годзе. Захапляючыся перыметральнай забудовай, мы часта забываем прамежкі ўнутры кварталаў. У кварталах з добрай капітальнай забудовай замест дзіцячых і фізкультурных пляцовак з зеляніной часта пераважнае месца займаюць гаражы, склады для паліва і іншыя гаспадарчыя будынкі. Гэтага мы павінны ўнікнуць у наступным годзе.

Кіраўніцтва гарадскога архітэктара павінна аддаць сур'ёзную ўвагу ўзняццю якасці архітэктуры будаўніцтва ў раёнах па-за цэнтральнай часткай горада. Ствараючы прыгожы праспект сталіцы — Совецкую вуліцу з сістэмай плошчаў і паркаў—не трэба забываць аб пад'ездах да горада з боку асноўных магістраляў і чыгункі.

Разгорнутае будаўніцтва ў абласных цэнтрах рэспублікі патрабуе шырокага ўдзелу ў ім усёй архітэктурнай грамадскасці. У Гомелі, Магілёве, Віцебску, Бабруйску, Рагачове намечана па 1951 год вялікае жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва. Неабходна, каб яно было праведзена ў адпаведнасці з генеральным планам, з улікам усіх патрэб насельніцтва.

Беларускія архітэктары і будаўнікі ў 1951 годзе будуць з выключным натхненнем працаваць над тым, каб пашы гарады і вёскі сталі яшчэ больш прыгожымі і велічнымі, каб совецкія людзі атрымалі многа новых утульных кватэр, грамадскіх і культурных будынкаў.

Я. КРАСОЎСКІ. «Віншаванне гераіні калгасных палёў».

Маладыя галасы

Аднойчы ў рэдакцыю прышоў кампазітар-самавучка Пётр Шыдлоўскі. Звонкім голасам ён заспяваў сваю новую песню. Натхнёныя простыя словы, празрыстая, як крынічная вада, мелодыя кранулі сваёй лірычнай глыбінёй.

Маладыя галасы народных кампазітараў П. Шыдлоўскага, Р. Галавасціка, П. Шэўкі і іншых улілі свежы струмень у беларускую сучасную песню, як пясна ўлівае сокі новага жыцця ў прыроду.

Яркім святлом заззяла ў мінулым годзе новая плеяда цудоўнай, улюбёнай у жыццё моладзі ва ўсіх жанрах нашага мастацтва.

«Паэзія сэрца мае такія-ж правы, як і паэзія думкі», — гаварыў у свой час Н. Чэрнышэўскі.

Спявачка Ніна Заблудаева і балерына Ліда Ражанава прынеслі ў тэатр паэзію сэрца, адухоўленасць, пястомныя пошукі новага. Выдатную музычнасць і ўжо даволі багатую вакальную тэхніку Заблудаева аддала стварэнню высакароднага нацыянальнага характару рускай жанчыны (Антаніда ў «Іване Сусаніне», Марфа ў «Царскай нявесце»), раскрыццю багацця яе духоўнага свету, маральнай стойкасці, самабытнай яркасці натуры.

Талент Ніны Заблудаевай сёлета атрымаў гарачае прызнанне на Міжнародным конкурсе ў Празе, лаўрэатам якога яна з'яўляецца. Артыстка карыстаецца любоўю і пашанай нашай моладзі. Яна цёпла вітала спявачку на першым сімфанічным канцэрце гэтага сезона.

Свежасцю павеяла ад выступлення Ліды Ражанавай на балетнай сцэне. Прывабныя рысы раскрыла артыстка ў балеце «Салавей». Пратэст Зоські-Ражанавай супраць нянраўды прыгонніцкага ладу — гэта голас шчырага сэрца, якое цягнецца да сонца, да сінята неба, да святла, да ўсяго таго, чаго варты вольны чалавек. Каханне і нянавісць Зоські маладая балерына раскрывае з выключнай непасрэднасцю і праўдзівасцю.

Па-дзіцячаму непасрэдная, пяшчотная яе Марыя («Бахчысарайскі фантан»), якая трапіла ў палон да татарскага хана і пакутуе ў няволі. Ражанава выяўляе то безнадзейны сум Марыі, то яе светлыя ўспаміны аб любай радзіме, аб блізкіх ёй людзях.

Таленавітым акторам сцвердзіў сябе Юрый Галкін у вобразе Валодзі Ульянава («Сям'я» ў тэатры імя Янкі Купалы). У ігры актора на першым плане думка, якая знітавана з павыйі пачуцця. У палкім, 17-гадовым юнаку артыст знайшоў і паказаў рысы будучага генія пролетарскай рэволюцыі, арганізатара комуністычнай партыі. Малады артыст даў магчымасць гранічна ясна адчуць маральную веліч, высакароднасць імкненняў Валодзі Ульянава, цвёрдасць і непахіснасць яго волі, любоў да прапоўнага чалавека.

З такой-жа ўпэўненасцю, як Галкін, поўным голасам загаварыў на сцэне ў гэтым годзе Уладзімір Будрэвіч.

Так па-новаму, але знітаванае адзіным метадам сацыялістычнага рэалізма, уздымаецца ва ўсіх жанрах маладое пакаленне талентаў, якое мужна спяраджае новае і свежае ў мастацтве.

Плённа пражыла 1950 год наша творчая моладзь ва ўсіх мастацкіх калектывах. З радасцю ўступае яна ў новы творчы год.

М. МОДЗЭЛЬ.

Макар ПАСЛЯДОВІЧ

Калгасныя наватары

Гады за чатыры да Вялікай Айчыннай вайны нам давялося наведаць калгас «Рассвет пераможца» Жлобінскага раёна. Справа была ўвосень, калі ўжо хораша і прыгожа разраслася багатая рунь, а на таку несціхана гудзела складаная малатарня. Аглядаючы поўныя засекі жыта і залацістай пшаніцы ў свірні, мы звярнулі ўвагу на гурбу нейкіх дзівосных каранёў, насыпаных на падлозе.

— А гэта наша новая культура, — ахвотна растлумачыў старшыня калгаса, заўважыўшы нашы цікаўныя позіркі. — З яе на заводах будуць вырабляць гуму на аўтамабільныя пакрышкі. Завецца кок-сагызам. І вельмі-ж гэтая новая культура падобна да звычайнага абдзіманчыка. Вы толькі паглядзіце, што ў яе за сок!

Старшыня разламаў самы большы каранёчык, і на месцы пералому адразу выступілі белаватыя кропелькі, якія, калі іх расцерлі між пальцаў, пачалі расцягвацца тонкімі пругкімі ніткамі. Гэта была каштоўнейшая сыравіна для нашай прамысловасці.

— Ну і набраліся мы клопату, пакуль выгадавалі цэнтнер каранёў! — усклікнуў кладаўшчык. — Самую лепшую гародную зямлю адвялі. Пільнавалі, як сваё вока... Надта-ж капрызнае насенне!.. Кажуць, што яго адшукалі недзе ў цяньшанскіх гарах.

Трэба было бачыць, з якой гордасцю паглядзелі калгаснікі на сваю першую ўдачу. Дзікая высакагорная расліна, пра біялогію якой мала тады што ведалі, дала ўраджай на калгасным полі. Цэлы цэнтнер з гектара!

Мы ўспомнілі гэты выпадак у сувязі з нашымі пасляваеннымі поспехамі ў сельскай гаспадарцы. На Мінскай абласной выстаўцы, побач выдатных узораў жыта і пшаніцы, лёну і канапель, дэманстраваліся і карэнні кок-сагызу з калгаса «Маяк соцыялізма» Рудзенскага раёна. Кожны гектар даў тут па **пяцьдзесят цэнтнераў** карэнняў кок-сагызу. За дваццаць гектараў каучуканосаў калгас атрымаў 436 тысяч рублёў прыбытку!

Адзін цэнтнер да вайны і пяцьдзесят цэнтнераў у 1950 годзе! Такія справы з асваеннем агратэхнікі важнейшай тэхнічнай культуры за самы кароткі тэрмін магчымы толькі пры соцыялістычнай сістэме земляробства, якое наша партыя, наш урад забяспечылі навуковымі кадрамі і найноўшай тэхнікай.

Трэба было назіраць, з якой увагай і прагнасцю, стараючыся не прапусціць ніводнага слова, слухала яшчэ нядаўна Алеся Шаплыка і яе звяньявыя лекцыі і парады навуковых работнікаў Інстытута каучуканосаў, каб зразумець, што справа з багатымі ўраджаямі кок-сагызу будзе паспяхова вырашана, што можна будзе збіраць з кожнага гектара нават больш, як па сто цэнтнераў карэнняў!

За час сваёй доўгай практыкі ў калгасе «Чырвоная змена» Любанскага раёна Алеся Шаплыка, цяпер Герой Соцыялістычнай Працы, падглядзела, што кок-сагыз найбольш пышна і добра расце на стараворыўных тарфяніках. Пасеў стратыфіцыраваным насеннем дае больш роўныя і дружныя ўсходы, чым сухім, а гнездавыя і шыракаполосныя метады ў шмат разоў павялічваюць ураджайнасць у параўнанні з вузкараднай сяўбою. У пасобных калгасах мы ўжо дасягнулі таго, што выхад каучука з гектара кок-сагызу не меншы, а нават большы, чым дае каучука гектар вядомага дрэва гевеі. Прычым падсочку гевеі можна рабіць толькі на чацверты або пяты год пасля пасадкі!

Так у цесным супрацоўніцтве з перадавой совецкай аграбіялогіяй нашы калгаснікі вырашылі яшчэ адну з важнейшых задач нашай партыі і любімага правадыра народаў вялікага Сталіна — забяспечыць патрэбы народнай гаспадаркі натуральным каучуком. У сувязі з гэтым перад соцыялістычнай сельскай гаспадаркай Беларускай ССР адкрыліся новыя перспектывы і магчымасці, тым больш, што тарфяніка ў нас хапае. Дрыгва, якая некалі была вялізным няшчасцем для селяніна-аднаасобніка, цяпер пры дапамозе магутнай тэхнікі машынна-трактарных станцый ператвараецца ў квітнеючыя палі, у залатое дно.

Вядома, усё гэта далося не вельмі лёгка. Часта, асабліва ў першыя гады асваення новай тэхнічнай культуры, замест кок-сагызу нахабна і дзёрзка разрастаўся абдзіманчык—злоснейшае пустазелле, вельмі падобнае на каучуканос і звярнутамі і формай лісцяў, нават каранёў. Потым, калі калгаснікі навучыліся ўжо з аднаго позірку адрозніваць, дзе кок-сагыз, а дзе абдзіманчык, па плантацыях з'явіўся новы, яшчэ больш небяспечны вораг — чарвяк драцянік. Справа ў тым, што ў карэннях кок-сагызу, апрача каштоўнейшага латэкса, — вельмі шмат бялкоў, цукру. Драцянікі прагна, як саранча, накідваюцца на кок-сагыз.

Совецкая навука, аднак, вельмі хутка знайшла сродкі барацьбы з небяспечным шкоднікам каучуканосаў. Разам з насеннем кок-сагызу па тарфяніках пачалі высяваць хімічны парашок — гексахларан. Вораг не вытрымаў і адступіў.

Культуру кок-сагызу, які асвоены многімі калгаснікамі рэспублікі і вырошчваецца сёння на асушаных балотах, як звычайная бульба альбо буракі, мы прывялі ў якасці аднаго з соцень прыкладаў таго новага, што стала ўваходзіць у шматпольныя севазвароты. На Мінскай абласной выстаўцы побач з выдатнымі ўзорамі канатніка і паўцнёвых канапель, дэманстраваліся экспанаты Беларускай дзяржаўнай селекцыйнай станцыі: новыя, высокаўраджайныя гатункі бульбы, буйназёрных гарохаў «Калгаснік» і «Зазерскі», перспектыўная форма буйназёрнай грэчкі «Мічурынская». Прычым, шмат якія з гэтых гатункаў ужо высяваюцца на вялікіх плошчах у саўгасах і калгасах рэспублікі, і ўраджай іх на 30 — 40 працэнтаў вышэй за тыя гатункі, якія мы ведалі раней. 25 — 38 цэнтнераў жыта гатунку «Зазерскае № 1» з гектара — ўжо не навіна для наватараў социялістычнай сельскай гаспадаркі, узброенай самымі найноўшымі і складанымі механізмамі.

Я памятаю з'яўленне ў 1927 годзе першага трактара на полі комуны «Звязда» Пухавіцкага раёна. Гэта быў імпартны «Фардзон», які праз сілу цягнуў звычайны двухлямешнік. Колькі людзей тады сыходзілася і з'язджалася з бліжніх і далёкіх вёсак паглядзець на дзіўную ў той час машыну! Але мінула некалькі год, і нашы магутныя заводы — Сталінградскі і Харкаўскі, Кіраўскі і Чэлябінскі — далі краіне сотні тысяч машын, якія лёгка цягнулі за сабою пяцікорпусныя агрэгаты. Сёння ў калгаснай вёсцы ўжо нікога не здзіўляюць не толькі трактары, але і самаходныя камбайны, кустарэзы і ільноўборачныя машыны. Цяжкая ручная праца ўсё больш ускладаецца на жалезныя плечы машыны і робіцца разнавіднасцю індустрыяльнай працы.

З гэтай прычыны, нам здаецца, цяжка ўявіць аповесць, або раман пра сённяшнюю вёску, у якіх-бы цэнтральнае месца займалі не людзі вузкай спецыялізацыі, як агранам, заатэхнік, механік, трактарыст, камбайнер, электраманцёр, а звычайны селянін ці сялянка. Каб вырошчваць трохсотпудовыя ўраджаі кок-сагызу, альбо двухсотпудовы ўраджай жыта, трэба было раней вывучыць не толькі агратэхніку, але і біялогію расліны, даведацца пра хімічны склад зярна і кораня. Гэта можна было зрабіць толькі ў школе, на курсах, на лекцыях нашых найлепшых спецыялістаў. Хіба можна параўнаць калгасніцу, Героя Соцыялістычнай Працы Алесю Шаплыка з гераіняй рамана пра дарэволюцыйную вёску? Ці магчыма было раней, каб звычайную сялянку абралі ў члены навуковага таварыства і яна выступала з лекцыямі не толькі ў сваёй вёсцы, але ў павеце, у губернскім цэнтры? Простая совецкая жанчына з Палесся Алеся Шаплыка не толькі вырошчвае багатыя ўраджаі кок-сагызу ў сваім калгасе, але яна, як член Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў, навучыла і навучае вытворчым «сакрэтам» сотні і тысячы іншых калгасніц.

Хораша выглядаюць у пейзажах узбуйненага калгаса прыгожыя школы, Дамы культуры, гідрастанцыі з трансфармацарнымі будкамі, з ясным электрычным святлом у аднаўленых пасля вайны хатах. Ужо не дзіва сустрэць на прасторнай сядзібе сельскагаспадарчай арцелі электраматор, які круціць складаную малатарню, цыркулярку, пампуе ваду ў водапанорную вежу, нагнятае паветра ў кампрэсар даільных агрэгатаў на малочнай ферме. І ўсюды вы знойдзеце наватараў вёскі нашага часу, якія настойлівай вучобай і працай павялічваюць багацці і магутнасць сваёй соцыялістычнай Радзімы. І наш пісьменніцкі абавязак — падхапіць усё новае, паказаць у паэмах і раманах саміх наватараў прыгажосць іх душы, іх настойлівае імкненне па шляху да комунізма.

Будучыня належыць нам

★

Усевалад КРАЎЧАНКА

★

Вось і зіма прышла, і Новы год з вясёлым прыветам грукае ў нашы дзверы: «Ці давольны ты мной, ці з радасцю мяне сустрэў? Ці спраўдзіў твае спадзяванні мой папярэднік, 1950 год, ці здзейсніў ты ў ім свае велічныя планы і замыслы?».

Не, не ашукаў нашых спадзяванняў мінулы год. Споўніў у ім усе свае самыя смелыя планы совецкі чалавек, усе намечаныя вялікія справы. Гэта быў год ураджайны на новыя вялікія перамогі совецкага народа ва ўсіх галінах нашага жыцця, год, у якім наш народ зрабіў яшчэ адзін смелы і шырокі крок па дарозе ў сваю светлую будучыню.

І мы радасна сустракаем нашага госця і друга — Новы год, шчыра вітаем яго, таму што ён прынясе нам здзяйсненне нашых далейшых мірных планаў і яшчэ больш наблізіць нас да высокай мэты. І гэтая вера і ўпэўненасць у нас не толькі таму, што совецкія людзі па прыродзе сваёй аптымісты, а і таму, што інакш не можа быць, што поступ гісторыі няўхільны і заканамерны, што не могуць не перамагчы праўдзівыя і велічныя ідэі комунізма.

* * *

Я толькі што вярнуўся з калгаса «Гігант» Бабруйскага раёна. У ім адбыліся зрухі, якія характэрны для ўсіх калгасаў нашай рэспублікі, зрухі, якія знамянуюць сабой новы якасны скачок у развіцці і гаспадарчым умацаванні нашых калгасаў.

У пачатку 1950 года на тэрыторыі Бортнікаўскага сельсавета размяшчалася сем калгасаў. У большасці сваёй гэта былі дробныя, аднабакова развітыя гаспадаркі. Ды і як яны маглі развівацца і расці, калі, напрыклад, у адным з калгасаў налічвалася ўсяго якіх 26 двароў. Тут нехапала рабочай сілы нават для стварэння брыгады па гароднінтву. У трох калгасах—з сямі ў сельсавеце — не было нават такіх дапаможных прадпрыемстваў, як кузня, і для рамонту сельгасінвентара прыходзілася штогод, ідучы на парушэнне Статута сельгасарцелі, наймаць людзей з суседніх калгасаў. Зямельныя масівы некаторых з гэтых калгасаў былі настолькі малыя, што на іх немагчыма было прымяняць багатую машынную тэхніку, якой валодала Міхалёўская МТС. Здаралася часамі так, што халастыя пераезды трактараў з аднаго поля на другое каштавалі больш, чым сама работа. Расказваюць, што быў тут адзін выпадак, калі малады трактарыст аднойчы не вытрымаў і, замест таго, каб выкручвацца па невялікіх палях суседніх калгасаў, пусціў свайго «Сталінца» напрамкі, пераворваючы калгасныя межы.

Суадносіны ўгоддзяў у гэтых калгасах былі таксама няправільныя. У той час, як у вёсках В. Бортнікі, М. Бортнікі зямлі было мала, што абмяжоўвала далейшае развіццё грамадскай гаспадаркі калгаса, у вёсцы Малінаўцы ворыўнай зямлі было столькі, што калгас не спраўляўся з яе апрацоўкай і вялікая колькасць яе з года ў год заставалася пад пералогамі.

Нельга сказаць, што гэтыя калгасы немелі дасягненняў. Але гэта былі дасягненні ў якой-небудзь адной—двух галінах гаспадаркі. Так, напрыклад, у вёсцы М. Бортнікі было шырока развіта садоўніцтва. Дастаткова сказаць, што тут сады прынеслі калгасу 400 тысяч рублёў прыбытку. Калгас вёскі Пустошка славіўся добрымі поспехамі ў жывёлагадоўлі. Акрамя таго, тут быў свой ветраны млын і ваўначоска. Вёска Азёры ганарылася высокімі ўраджаямі, добра развітым паляводствам. Брыгада Пілецкага Івана, напрыклад, дабілася сёлета на асобных участках па 19 цэнтнераў збожжа з гектара.

З часам калгаснікі пачалі ўсё больш выразна адчуваць, што ім становіцца цесна ў рамках сваіх маленькіх гаспадарак, што няма магчымасці вырашаць тыя вялікія задачы, якія ставіць перад калгасамі жыццё, што раздробленасць гаспадарак перашкаджае далейшаму гаспадарчаму і культурнаму развіццю. Не маючы магчымасці выкарыстаць на поўную сілу машынную тэхніку, яны не маглі дабівацца высокіх ураджаяў. Не пад сілу ім было пабудаваць у адзіночку, скажам, электрастанцыю, лесапілку, млын, не маглі яны ўстанавіць у сябе радыёвузел, пабудаваць кінатэатр. А ва ўсім гэтым калгаснікі адчувалі вострую патрэбу.

— Ідэя аб'яднання, — расказвае старшыня ўзбуйненага калгаса Іларыён Ільіч Худавец, — практычна была падказана нам вопытам перадавых калгасаў, яна была прадыктавана самім жыццём.

Калгаснікі сямі калгасаў з'ядналі ў адно раздробленыя гаспадаркі і назвалі сваю новую сельгасарцель—«Гігант».

Новы калгас і сапраўды адпавядае сваёй назве. Ён аб'ядноўвае 712 калгасніцкіх двароў, мае 3.150 гектараў ворыўнай зямлі, 116,5 гектара садоў. Палі «Гіганта» абслугоўвае 6 трактараў, два самаходныя камбайны, ільнацерабілка, некалькі малатарняў МТС. Калгас мае 7 аўтамашын. На грамадскіх фермах налічваецца звыш паўтысячы коней, 800 галоў буйнай рагатай жывёлы, 540 авечак, 430 свіней, звыш 2.300 штук хатніх птушак.

Калгаснікі прынеслі ў аб'яднаную гаспадарку не толькі матэрыяльныя багацці, але і свой багаты вытворчы вопыт, свае цікавыя і дзёрзкія мары, якія цяжка было здзейсніць у дробным маламоцным калгасе.

Прайшло толькі паўгода працы ў новых умовах, але якія вялікія зрухі адчуваюцца сёння ў «Гіганце»! Буйнай сельгасарцелі стала пад сілу развіваць усю сваю шматгалінную гаспадарку — жывёлагадоўлю, птушкагадоўлю, садаводства, пчолапасекі, выкарыстоўваць усе ўнутрыкалгасныя рэзервы для развіцця паляводства. Як вядома, зяблевае ворыва спрыяе атрыманню высокіх ураджаяў. Сёлета калгаснікі «Гіганта» здолелі ўзняць пад зяблева 1.340 гектараў — значна больш, чым узнімалі раней усе сем дробных калгасаў разам. На цэлых 200 гектараў засеяна ў 1950 годзе і азімых больш, чым у мінулыя гады засявалі ўсе 7 калгасаў. І гэты пасеў праведзены якасна, па ўсіх правілах агратэхнікі. Калі ў сярэднім ураджай зернавых у прайшоўшым годзе склаў 8—10 цэнтнераў з гектара, то ў будучым годзе намечана зняць не менш 12—14. Дзеля гэтага калгас вывез на палі 200 тон мінеральных угнаенняў, 500 тон гною і торфу.

Толькі за 6 месяцаў будаўнічая брыгада пабудавала два кароўнікі даўжынёй па 70 метраў, тыпавую канюшню, цялятнік, артэзіянскі калодзеж, кармакухню для жывёлы.

Кожны аўторак у калгасе — дзень агратэхвучобы. Пад кіраўніцтвам агранома МТС тав. Красновіч брыгадзіры, члены праўлення, перадавыя калгаснікі вывучаюць творы Вільямса, авалодваюць асновамі агратэхнічных ведаў.

Многа планаў на будучае ў калгаснікаў «Гіганта»: развіццё паляводства, правядзенне землеўпарадкавання, увядзенне палявога і травапольнага севазваротаў, гарманічнае развіццё ўсіх галін гаспадаркі, асваенне новых земляў, механізацыя ўсіх працаёмкіх работ.

Але сёння калгаснікамі «Гіганта» заваладала новая думка — пабудаваць калгасны аграгарод, сапраўдны аграгарод з цаглянымі дамамі, уласнай электрастанцыяй, Домам культуры на тысячу месц, стадыёнам і бульварамі, з радзільным домам, з цагельным заводам, млыном, лесапілкай — усім тым, што павінен мець сёнешні соцыялістычны горад. Адчулі людзі, што наспеў час для такой цудоўнай справы і што ў іх ужо дастаткова сіл, каб яе ажыццявіць.

Гэтымі днямі, у сувязі з планамі будаўніцтва аграгарода, старшыня калгаса тав. Худавец прыязджаў у Мінск. Тут ён даведаўся, што не толькі ў «Гіганце» зарадзіліся такія смелыя думкі. Дзесяткі і сотні калгасаў нашай рэспублікі, падтрыманыя дзяржавай, у новым годзе пачнуць закладку аграгарадоў, якія сатруць апошнія грані паміж горадам і вёскай.

* * *

Зіма. Заснулі палі «Гіганта», пакрытыя роўнаю снегавою коўдрай, застыў у маўчанні прыпарошаны снегам лес, прыціхлі рэкі, скаваныя першым маладым лёдам. Выйдзеш зараз за вёску, у поле, на ўзгорак, з якога відаць далёкія палеткі і сады і рэчка Ала, — і стаіш, здзіўляючыся цішыні, якая пануе вакол. Здалёк відаць, як зайка-русак шэрым клубочкам павольна кавыляе па свежай парошы, прыпыніцца, паглядзіць і зноў пацёхае бяжыць у бок лесу, апранутага ў прыгожы зімовы ўбор. Нейкае асабліва хвалюючае пачуццё выклікае велічны малюнак зімы, калі ўся прырода як-бы замірае ў задуменні і маўклівым спакоі.

Цішыня гэтая ў полі не надоўга. З першымі промнямі вясны зноў ажыве і зашуміць калгаснае поле, зноў загучыць тут песня трактараў, песня машын. Акрыленыя першымі поспехамі працы ва ўзбуйненым калгасе, яшчэ з большай рупліваcцю і запалам выйдуць калгаснікі ў поле заваёўваць новы ўраджай, змагацца за хутчэйшае здзяйсненне сваіх мараў.

Навіны літаратуры і мастацтва

Часопіс «Полымя» ў 1951 г.

Літаратурна-мастацкі часопіс «Полымя» ў новым годзе надрукуе рад буйных твораў беларускіх пісьменнікаў. Проза будзе прадстаўлена працягам рамана «Векапомныя дні» Міхася Лынькова і другой часткай рамана «Святло над Ліпскам» Макара Паслядовіча.

Аб Вялікай Айчыннай вайне расказваецца ў новым рамане І. Гурскага «У агні». У аповесці маладога пісьменніка Міколы Лобана «Іркуцянка», якая будзе змешчана ў першым нумары, апавядаецца аб дапамозе тыла фронту.

Калгаснаму будаўніцтву прысвячае першую кнігу рамана Іван Шамякін, а таксама новую аповесць Іван Грамовіч. Ул. Шахавец у аповесці «Насустрач» паказвае барацьбу беларускага народа за мір і стваральную працу.

Часопіс у 1951 годзе надрукуе паэтычныя творы Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Кастуся Кірэенкі і інш. З паэмамі на старонках часопіса выступяць А. Зарыцкі («Пабрацімы» — аб інжынерах-меліяратарах), А. Астрэйка («Залатая крыніца» — аб гаспадарчым умацаванні калгаса), А. Вялюгін (аб барацьбе за мір), С. Дзяргай (аб вялікіх сталінскіх будоўлях).

Драматургія ў часопісу будзе прадстаўлена п'есай К. Губарэвіча «Цытадэль славы» і першым творам маладога драматурга Гатальскай «Жыццё пачынаецца» (аб калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР).

Мастацкая выстаўка

У Мінскім Доме афіцэраў 1-га студзеня 1951 года адкрываецца выстаўка беларускіх мастакоў. На ёй будуць экспаніраваны работы народнага мастака БССР, лаўрэата Сталінскай прэміі З. Азгура «Ленін і Сталін — арганізатары Совецкай дзяржавы», скульптурныя партрэты беларускіх пісьменнікаў П. Броўкі, М. Танка і П. Панчанкі. Сярод жывапісных палотен—кампазіцыйныя карціны: «Таварыш Швернік Н. М. на заводзе імя Кірава»— Г. Бржазоўскага, «Таварыш Швернік Н. М. у беларускіх калгаснікаў» — З. Паўлоўскага, «Знатныя людзі калгаса імя Молатава» — Л. Рана, «Апаратны цэх Мінскага тонкасуконнага камбіната»— Х. Ліўшыца, «На конеферме»—М. Белініцкага.

Мастак А. Кроль экспаніруе карціну «Ад шчырага сэрца» — аб зборы подпісаў у рэспубліцы пад Стакгольмскай Адозвай. Гродзенскі мастак В. Марозаў выстаўляе графічна-акварэльную сюіту «Па сталінскіх мясцінах». Заслужаны дзеяч мастацтва БССР Ул. Будрэвіч выставіць работы «Жыта», «Пейзаж», М. Дучыц— пейзажную карціну «Лес».

Мастакі з абласцей будуць прадстаўлены на выстаўцы пейзажамі К. Максімцава (Баранавічы), Б. Звенігародскага (Гомель), І. Пушкова (Гродна) і партрэтам П. Явіча — «Бацька Мінай» (Віцебск).

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Марыкс і маладыя мастакі Масленнікаў, Блішч і Жалток выстаўляюць эскізы і макеты да новых спектакляў.

Новыя спектаклі

У навагодняе свята Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Купалы пакажа новы спектакль «Сям'я Лутоніных» лаўрэатаў Сталінскіх прэмій І. Пыр'ева і бр. Тур (рэжысёр — народны артыст БССР, лаўрэат Сталінскай прэміі К. Саннікаў). У галоўных ролях выступяць народны артыст БССР Л. Рахленка (стары рабочы Лутонін), заслужаныя артысты рэспублікі — Л. Шынко (дачка Лутоніна — Вольга Калмыкова), Б. Кудраўцаў (Калмыкоў), І. Шаціла (Баброў). Спектакль афармлены маладым мастаком А. Хашкоўскім.

У студзені 1951 года будзе выпушчана новая пастаноўка «Вішнёвы сад» А. Чэхава (рэжысёр — М. Міцкевіч).

* * *

Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў святочныя дні пакажа новы спектакль «Яе сябры» В. Розава (рэжысёр — Л. Мазалеўская).

* * *

Пінскі абласны тэатр і тэатр імя Ленінскага комсамола (Брэст) у новым годзе пакажуць спектаклі «Калі зацвітаюць сады» па п'есе В. Палескага.

Аб жыцці совецкай моладзі раскажа пастаноўка «Призвание» Г. Штэйна і А. Кузняцова (рэжысёр — С. Рахманаў) у Гродзенскім тэатры.

Гэтыя спектаклі будуць паказаны ў час навагодняга свята.

Архітэктурныя праекты

Інстытут праектавання сельскага калгаснага будаўніцтва БССР распрацоўвае тыповыя архітэктурныя праекты для рэспублікі.

У 1951 годзе 60 беларускіх архітэктараў створаць звыш 200 генеральных архітэктурных планаў, па якіх будуць пабудаваны цудоўныя аграгарады ў розных абласцях рэспублікі.

Па праекту маладога інжынера-планіроўшчыка І. Каробкіна, які ў мінулым годзе скончыў будаўнічае аддзяленне Горацкай акадэміі, будуецца аграгарод у калгасе імя Кірава Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Аграгарод будзе налічваць 600 двароў.

У калгасе імя Молатава Смаргонскага раёна Маладзечанскай вобласці аграгарод будуецца па праекту архітэктара Е. Косіч.

Песні, сімфоніі, оперы

Артысты філармоніі БССР у святочныя дні выканаюць новую песню заслужанага дзеяча мастацтва Я. Цікоцкага «Навагодняя застольная» на словы М. Гамолкі.

У пачатку наступнага года беларускія кампазітары ўзбагацяць нашу музыку новымі сімфанічнымі творамі. Сярод іх— сімфанічная паэма «Канстанцін Заслонаў» Ул. Алоўнікава, «Калгасная сюіта» П. Падкавырава (для сімфанічнага аркестра), фантазія для скрыпкі з аркестрам М. Аладава, сюіта для віяланчэлі з фартэпіяна А. Багатырова.

Кампазітар Д. Лукас у пачатку новага года закончыць оперу «Песня аб шчасці» (лібрэта М. Клімковіча) аб аднаўленні калгасаў у пасляваенныя гады.

Раённыя кінатэатры

У 1951 годзе будуць адкрыты раённыя кінатэатры ў Жлобіне (Гомельская вобласць), Капаткевічах (Палеская вобласць), Слаўгарадзе (Магілёўская вобласць), у Дрысе, Глыбокім, Ушачах (Полацкая вобласць), у Давыд-Гарадку (Пінская вобласць), Ваўкавыску і Берастовіцах (Гродзенская вобласць).

У кожным кінатэатры, пабудаваным па тыповаму праекту, ёсць зала для гледачоў на 200 месц, прасторнае фае, вестыбюль і білетная зала.

Тэатры — дзецям

У час канікул Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета пакажа дзецям сталіцы оперныя і балетныя спектаклі «Дэман», «Іван Сусанін», «Прададзеная нявеста», «Кармэн», «Чырвоны мак» і «Салавей».

У час дзіцячых ранішнікаў сіламі артыстаў тэатра будуць дадзены канцэрты для школьнікаў.

У студзені месяцы тэатр таксама пакажа два спектаклі для дзяцей—оперу «Марозка» лаўрэата Сталінскай прэміі М. Красева і балет «Айболіт» І. Марозава.

* * *

Дзяржаўны Рускі драматычны тэатр БССР пакажа два спектаклі для дзяцей. У пастаноўцы «Рэпка» П. Малярэўскага (рэжысёр — народны артыст БССР Д. Арлоў) будуць заняты пераважна маладыя артысты.

У новым годзе будзе таксама адноўлены спектакль «Хаціна дзядзі Тома» (рэжысёр — С. Уладычанскі).

Ул. КОРБАН

„ДАПАМОГА"

(Байка)

Паміж арэшніку і хвоі
Ішлі па лесе двое —
Адзін наперадзе, другі услед за ім.
І вось пярэдні на шляху сваім
Схапіў арэшыну рукою,
Прыгнуў да нізу за сукі
І выпусціў з рукі.
А тая разагнулася, як змажа
Другога. А пярэдні кажа:
— Я, браце, дапамог табе.
Ты мне павінен выказаць падзяку.
— А чым ты дапамог? — пытае небарака,
Абмацваючы гуз вялікі на ілбе.
— Ды я-ж лясіну прытрымаў!
Павер, што без мяне, яна-б цябе зусім забіла.
— А-а, кінь, — яна-б мне ліха не зрабіла,
Каб ты яе рукамі не чапаў.

Вось гэтак і Амерыка дапамагае.
Хто гэту «дапамогу» атрымае,
Той заўжды гуз паміж вачыма мае.

НАДЗВЫЧАЙНАЕ СТАНОВІШЧА Ў БЕЛЫМ ДОМЕ

Малюнак А. ВОЛКАВА

Тэкст П. ПАНЧАНКІ

Белы дом здаўна вядом быў
Па мелодыі адной:
— Бомба! Бомбу! Бомбе! Бомбы!
— На вайну! Вайне! Вайной!
Зноў чуваць з-за акіяна
Надзвычайны, нечуваны,
Істэрычны новы «бом!» —
Загарэўся Белы дом.
Загарэўся,
Закурыўся,
Бо карэец
Не скарыўся.
У Белым доме
Выюць янкі
Ад карэйскай
Ліхаманкі.
Ахапіў банкіраў жах:
Б'е Карэя па зубах.
І з брыгады
Турак-гадаў
Не ўцалеў ніводзін гад —
Усе ад страху
Да алаха
Паляцелі на парад...
Паглядзіце ў левы кут:
Намалёван янкі тут.
Ён крычаў «О'кэй!» і гвалціў,
А цяпер мычыць «капут».
А за ім плывуць у трумах
Мерцвякі праз акіян...
Звар'яцеў ад злосці Трумэн,
Грымнуў бомбай ў барабан:
— У паход!
На бой!
За мной!
На Кітай пайду вайной!
— Вось адвага!
Вось дзе спрыт! —
Пахваляе Уол-стрыт.
У гэтай труманаўскай бандзе
Задае звярыны тон —
Па крывавай прапагандзе
Галоўмайстар —
Уінстон.
Тут і Этлі,
Тут і Пій —
Долар іх даўно купіў.
Тут і штаб.
Стаіць ля карты
Сам карэйскі кат —
Макартур.
Пашматаны людаед
Кансультацыю дае.
Побач Маршал

(ды не маршал
і не воін, а дзяншчык:
ліжа долару гамашы
з даўніх пор яго язык) —
Невук, хам і салдафон,
Уолстрыцкі грамафон.
Тут, засвоіўшы «культуру»
Тых, хто найміта купіў,
Нейкі турак-макартурык
Сто (на карце!) рот разбіў.
Ну а Брэдлі — з гадаў гад —
Аддае такі загад:
— Зараджаць балоны газам,
Будаваць на Марсе базы,
Каб адразу ўсё забіць —
Ад Пекіна да Берліна,
Ад Баку да Сахаліна
Поўпланеты разбамбіць...
А цяпер сюды глядзіце —
Кабінет на Уол-стрыце.
Ад якіх такіх турбот
Кінула Джон Буля ў пот?
Уол-стрыт з ім абнаглеў,
Дзядзьку Сэма душыць гнеў:
— Не круці хвастом, брытанскі,
Так сказаць, аблезлы леў,
Самалёты дам і танкі,
Дам гармат і куль...
Але
Ты мільён салдат мне дай,
Каб нам рушыць на Кітай.
Ты другі мільён мне дай,
Каб...
А сам пагаладай!
Пазнаём адразу ўсе мы,
Хто укленчыў перад Сэмам:
То бандыт па кліцкі Броз —
Уолстрытаўскі барбос.
Адэнауэр, нібы заяц,
Затаіўся і чакае.
Гэты ўсё даўно прадаў:
Рур і Рэйна воды.
Уол-стрыт, нібы удаў,
Смокча кроў з народа.
І жадаюць той народ
Зноў манапалісты
Нацкаваць на наш Усход,
Кінуць арміі ў паход,
Па шляху фашыстаў...
І прысніў пад гэты вэрхал
Хтось пятлю, з асіны кол —
З дваццаць пятага паверха
Сігануў, як Фарэстол.
Бон! Бон!
Бом! Бом!
Вар'яцее Белы дом.
Ды мацнее год ад году
Між усіх народаў згода:
— Міру быць!
— Вайне не быць!
А палезуць банды зброду
Да чужога агароду,
Скажуць мірныя народы:
— Білі, б'ём і будзем біць!

Галоўны рэдактар П. КАВАЛЕЎ.

Рэдкалегія: В. ВІТКА (нам. галоўн. рэдактара), П. ГЛЕБКА, Г. КЛЯБАНАЎ, М. ЛЫНЬКОЎ, Я. МАЎР, Ул. НЯФЁД, П. ПАНЧАНКА, К. САННІКАЎ.

АТ 11814. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-04, аддзелаў літаратуры і мастацтва 2-14-94. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12.